ВЫДАЕЦЦА З КАСТРЫЧНІКА 1991 г. / № 1 (1127) 4 студзеня 2014 г.

Лаўрэат прэміі «За духоўнае адраджэнне»

WWW.KIMPRESS.BY

# КУЛЬТУРА







# ГОД ЧЫСТАГА СВЕТУ









Мы, дарослыя людзі, акунаемся ў атмасферу дзяцінства і ловім жывыя адчуванні ад кантакту з гэтым чыстым светам. Наш каляндар — бадай, своеасаблівы метад пагружэння ў яе, шанц адысці ад стандартаў будзённасці, атрымаць першапачатковае ўражанне ад часу ды падзей, якія адкрываюцца перад намі, ад прыроды і святаў, ад казак і легенд і ад шмат чаго, чым напоўнены душы і сэрцы юных мастакоў. Усе творы, пабудаваныя на свабоднай, нязмушанай гульні ўяўлення — жыццярадасныя, натхнёныя, нестандартныя, — сведчаць пра тое, што ў гэтым свеце пакуль усё на сваіх месцах, хаця б у дзяцінстве. Няхай і далей так будзе… І яшчэ хочацца падзякаваць усім тым педагогам, якія прывілі сваім вучням любоў да Бацькаўшчыны, да той зямлі, на якой ім давядзецца жыць ды працаваць, незалежна ад таго, стануць яны мастакамі ці не.

С. 2 — 14











"К" інфармуе

# Сустрэцца ў студзені!

**9 — 12 студзеня ў Брэсце ў 26-ы раз пройдуць "Студзеньскія музычныя вечары". Гэты Міжнародны фестываль класічнай музыкі збярэ прадстаўнікоў з 10-ці краін.**

Увогуле, непаўторным і запамінальным будзе кожны з шасці вечароў — нават калі ён прыпадзе на дзённы час, бо ў суботу і нядзелю адбудуцца па два канцэрты. Урачыстае адкрыццё фестывалю забяспечыць Дзяржаўны акадэмічны сімфанічны аркестр Беларусі пад кіраўніцтвам народнага артыста краіны Аляксандра Анісімава. На гэты раз сапраўдный сенсацыяй "Студзеньскіх вечароў" стануць спевы расійскай салісткі Ірыны Багачовай, якая плённа супрацоўнічае з аркестрам ужо шмат гадоў.

А ці не сенсацыя — выступленне джазквартэта Гары Гутмана з ЗША? Шмат уражанняў прынясе і Калядны баль, на якім будуць іграць сімфанічны аркестр Брэсцкага дзяржаўнага музычнага каледжа імя Р.Шырмы і Брэсцкі гарадскі аркестр духавой і эстраднай музыкі. Побач з імі госці — Сілезскі квартэт з Польшы. Яшчэ адзін брэсцкі калектыў — Камерны аркестр абласной філармоніі — можна будзе пачуць у адным з дзённых канцэртаў.

Ды ўсё ж самым, бадай, сюрпрызным абяцае быць закрыццё фестывалю з удзелам сусветна вядомай салісткі Вялікага тэатра Расіі Ганны Аглатавай, трыа італьянскіх тэнараў "Школа Паварoці", іншых знаных гасцей і, галоўнае, гаспадароў — сімфанічнага аркестра Брэсцкага акадэмічнага тэатра драмы, на сцэне якога і адбудуцца ўсе канцэрты.

— Наш аркестр, — гаворыць яго кіраўнік Аляксандр Сасноўскі, — удзельнічае ў фестывалі ўжо 16 гадоў запар. Дзякуючы заснавальніцы, дырэктару і мастацкаму кіраўніку фестывалю, заслужанаму дзеячу мастацтваў Беларусі Лiлii Батыравай, мы выступалі са знакамітымі спевакамі і музыкантамі многіх краін. Таму "Студзеньскія вечары" сталі для нас і выканальніцкай школай. Фінальным акордам стане своеасаблівы "сумесны праект" — італьянскія тэнары праспяваюць з аркестрам не толькі арыі, але і кампазіцыю "Парад спевакоў", якую больш як 20 гадоў таму напісаў беларускі дырыжор і музыкант Юрый Цырук.

# Запрашае "Magnificat"

**IX Міжнародны фестываль хрысціянскіх фільмаў і тэлепраграм "Magnificat", які паводле завядзёнкі мусіў адбыцца леташняй восенню, перанесены на пачатак новага года. Фестываль пройдзе ў сценах сталічнага касцёла Сымона і Алены і будзе доўжыцца два дні — 4 і 5 студзеня. Адкрыецца "Magnificat-2013" дакументальным фільмам іспанскай вытворчасці "Хто ён, Папа Францыск?" пра жыццё абранага летась пантыфіка.**

Мы звярнуліся да старшыні фестывалю, рэжысёра-дакументаліста Юрыя Гарулёва з просьбай распавесці пра асаблівасці гэтага кінафоруму.

— Найперш мушу вас запэўніць, — кажа спадар Юрый, — што мастацкі ўзровень фільмаў сёння, як і раней, — высокі. Гледачы не будуць расчараваныя. На гэтым перадюбілейным фестывалі да ліку сталых краін-удзельніц далучылася новая — афрыканская Замбія. На жаль, праз матэрыяльныя прычыны "Magnificat-2013" пройдзе ў скарочанай версіі. Раней асноўнай пляцоўкай фестывалю быў горад Глыбокае, а сёння праграма не выходзіць за межы Мінска. У васьмі папярэдніх форумах удзельнічала больш як 30 краін, штогод — 15 — 16. Сёлета іх будзе толькі дзясятак.

Фестываляў такога кшталту ў свеце няшмат. У Польшчы ёсць фестываль-пабрацім нашага, у Італіі — кінафэст "Рэлігія сёння", два рэлігійныя форумы ладзяцца ў Расіі. Вось, бадай, і ўсё, што на слыху ў прафесіяналаў. Калі "Magnificat" распачынаўся, на беларускім тэлебачанні не было праграм рэлігійна-духоўнага зместу, зараз жа іх можна паглядзець на многіх каналах. Спадзяюся, што мы разам з іншымі паспрыялі добрай справе, адыгралі ролю каталізатара культурнага працэсу. Нагадаю, на фестываль уваход вольны. Чакаем на кінасеансах мінчан і гасцей сталіцы.

# Залатыя фаліянты чакаюць...

**Адна з падзей студзеня — Нацыянальны конкурс "Мастацтва кнігі — 2014" (LIII), што ладзіцца Міністэрствам інфармацыі Беларусі. Па традыцыі ён вызначыць лепшыя выдавецкія праекты, што сталі падзеяй у нацыянальным кнігавыданні за мінулы год.**

Неацэнная роля конкурсу і ў павышэнні мастацкай і паліграфічнай культуры кнігі, у развіцці кніжнага мастацтва, а таксама — у папулярызацыі лепшых дасягненняў нашых выдавецтваў за 2013 год. Нацыянальны конкурс пройдзе 16 — 17 студзеня.

Па кожнай заяўленай намінацыі ад выдавецтва прадстаўляецца не больш за тры выданні.

Гран-пры конкурсу — намінацыя "Трыумф". Пераможца будзе ўшанаваны дыпломам імя Ф. Скарыны і знакам-сімвалам "Вялікі залаты фаліянт".

"Малыя залатыя фаліянты" і спецыяльныя дыплом уручаюцца па тэматычных намінацыях: "ЛІТ-фармат" (літаратурна-мастацкі кірунак), "Падручнік новага стагоддзя" (навучальныя выданні), "Фотапогляд" (фотаальбомы і фотакнігі), "Разам з кнігай мы расцём" (выданні для дзяцей і юнацтва), "Залатыя скрыжалі" (даведнікі і энцыклапедыі), "АРТ-кніга" (выданні па выяўленчым мастацтве, факсімільныя, рэпрынтныя, бібліяфільскія кнігі), "Эўрыка" (навуковыя, навукова-папулярныя выданні), "Духоўнасць" (выданні духоўна-асветніцкага кірунку).

Прадугледжаны і спецыяльныя намінацыі з уручэннем дыплома і памятнага знака-сімвала "Малы залаты фаліянт": "За ўклад у захаванне духоўнай спадчыны", "За прапаганду чытання", "Садружнасць" (сумесныя выдавецкія праекты), "У люстэрку часу" (кнігі, выдадзеныя па замове).

Персанальная намінацыя "Майстэрства" прызначана для лепшых ілюстратара, дызайнера, фотамастака кнігі, якім таксама ўручаецца спецыяльны дыплом і "Малы залаты фаліянт".

Рэйтынг

Самыя чытаныя матэрыялы газеты "Культура" ў 2013 годзе (паводле даных статыстыкі нашага сайта kimpress.by):

**1. "Тэатр.by: быць ці не быць?",**
аўтар — Алег ЧЭЧАНЕЎ; № 37.

**2. "Падзяліць — не падзяліцца?",**
аўтар — Зміцер ЮРКЕВІЧ; № 11.

**3. "А ў "тырнэтах" пішуць: заняпад...",**
аўтар — Ілья СВІРЫН; № 34.

**4. "Якія плюсы і мінусы ўваходжання "Белвідэацэнтра" ў структуру "Беларусьфільма"?",**
аўтар — Дар'я АМЯЛЬКОВІЧ; № 29.

**5. "Заўтра не прыйдзе ніколі?",**
аўтар — Сяргей ПУКСТ; № 31.

**6. "У фотатумане штосьці відаць?",**
аўтар — Дар'я АМЯЛЬКОВІЧ; № 13.

**7. "Шчаўкунок": "яшчэ адна цяпер упоравень з іншымі?",**
аўтар — Надзея БУНЦЭВІЧ; № 14.

**8. "Шчаўкунок". Страсці, або Ці зацікаўлены тэатр у незалежнай экспертызе?",**
аўтары — Надзея БУНЦЭВІЧ, Таццяна ТЭАДАРОВІЧ, Вольга БАРШЧОВА; № 17.

**9. "Вялікая беларуская сцяна перад "новай драмай",**
аўтар — Дар'я АМЯЛЬКОВІЧ; №№ 26, 32, 35, 40.

**10. "Прыступкі" фота да мастацтва",**
аўтар — Дар'я АМЯЛЬКОВІЧ; № 8.

Рады вашай актыўнасці! Выпісвайце газету, чытайце і каментуйце матэрыялы і ў 2014 годзе!

Будзем на сувязі!

**Паважаныя чытачы!** Нам цікавае ваша меркаванне па тэмах нумара. **Пішыце** на адрас: 220013, г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 77, альбо на электронную скрыню kultura@tut.by, **тэлефануйце** ў рэдакцыю па нумары 8-017-286-07-97, **абмяркоўвайце** на facebook.com/kimpressby, vk.com/kimpressby, twitter.com/kultura_by!

Фактаграфія

**Год гасціннасці**
абвешчаны ў 2014-м Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь. Сярод мэт называюцца развіццё турызма і турінфраструктуры з улікам гістарычнага і культурнага багацця краіны.

**718 944 970,0 рублёў**
Такая сума выдаткаў закладзена ў Законе Рэспублікі Беларусь "Аб рэспубліканскім бюджэце на 2014 год" у частцы культуры.

**"Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб культуры"**
у выглядзе законапраекта неабходна падрыхтаваць у 2014 годзе згодна з Планам, зацверджаным Прэзідэнтам краіны.

**Васіль Кавальчук,**
народны артыст Беларусі, знакаміты саліст Беларускай оперы, адзначыў 70-годдзе. Віншаванне яму накіраваў Кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка.

**1 красавіка**
Да гэтай даты запланавана далучэнне Літаратурнага музея Максіма Багдановіча да Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры.

**Полацк**
сёлета прыме больш як дзясятак фестываляў. Сярод іх — "Званы Сафіі", фэст старадаўняй і сучаснай камернай музыкі, а таксама — сярэднявечнай культуры "Рубон". Запланаваны і святы мёду, малака, грыбоў, рыбалкі, лазневы і веласіпедны фэсты.

Фотасюжэт нумара

# Якімі кадрамі віншавалі фатографы?

Каб даведацца, мы зазірнулі ў іх акаўнты ў сацыяльных сетках.

Вадзім Качан.



Георгій Ліхтаровіч.


Антон Матолька.


Валерый Вядрэнка.


Юрый Іваноў.


Сяргей Міхаленка.



Андрэй Шчукін.


Аляксандра Салдатава.


Вольга Шукайла.



Наталля Дораш.


Страта

# Адплыў у вечнасць

Так здарылася, што "Ладдзя Роспачы" паводле У.Караткевіча сталася яго апошняй працай у родным тэатры: 2 студзеня памёр галоўны мастак Беларускага дзяржаўнага тэатра лялек Валерый Рачкоўскі. Прэм'ера ў Польшчы, да якой творца падрыхтаваў эскізы, выйдзе ўжо без яго. Усяго ж на рахунку мастака — больш як 75 спектакляў для дзяцей і дарослых, якія знайшлі сваіх шчырых прыхільнікаў не толькі ў Беларусі, але і ў Расіі, Літве, Польшчы, Балгарыі, Сербіі. Лялькі былі яго сапраўдным прызваннем. Можна сказаць, яны самі знайшлі свайго Майстра. Бо скончыўшы аддзяленне дызайна нашай Акадэміі мастацтваў па спецыяльнасці "прамысловая графіка", ён быў размеркаваны на... "Інтэграл". Але яшчэ ў час вучобы афармляў студэнцкія спектаклі лялечнікаў, што і вызначыла яго творчы шлях. Лялькі Рачкоўскага — самыя розныя па эстэтыцы і тэхналогіі, але ўсіх іх яднае нейкая асаблівая "чалавечнасць", якая выяўляецца зусім не ў поўным падабенстве (тут якраз усё наадварот!), а ў той іскрынцы дабрыні, што здольная ажывіць любую істоту, зробленую чалавечымі рукамі. Спектаклі, як і людзі, сыходзяць — лялькі, бы выяўленне чалавечай душы, застаюцца...

**"Культура"ўцы**

**Калектыў Беларускага тэатра "Лялька" выказвае спачуванні родным і калегам у сувязі са смерцю галоўнага мастака Беларускага дзяржаўнага тэатра лялек Валерыя Рачкоўскага.**

КУЛЬТУРА
№ 1 / 4 студзеня 2014 г. / 3

# СТУДЗЕНЬ 2014

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| ПН | | 6 | 13 | 20 | 27 |
| АЎТ | | 7 | 14 | 21 | 28 |
| СР | 1 | 8 | 15 | 22 | 29 |
| ЧЦ | 2 | 9 | 16 | 23 | 30 |
| ПТ | 3 | 10 | 17 | 24 | 31 |
| СБ | 4 | 11 | 18 | 25 | |
| НДЗ | 5 | 12 | 19 | 26 | |



Марыя Школьнік, 12 гадоў. "Казка на Каляды".

Ева Заў'ялава, 10 гадоў. "Зімовы нацюрморт".



Вольга Навумава, 14 гадоў. "Тры каралі".



Магілёўская дзіцячая мастацкая школа мастацтваў

## "Ой, калядачкі..."

Паглядзіце, як юны мастак эмацыйна і непасрэдна адлюстраваў "інсітным" пэндзлем вобраз старажытнага свята — Раждажства! І як тут не ўспомніць гуллівыя, іскрыста-заліхвацкія мулявінска-"песняроўскія" музычныя цытаты: "Ой, Калядачкі, бліны-ладачкі, / Ой, люлі-люлі, бліны-ладачкі!" Але гэтае свята, як вы бачыце на іншых работах, што побач, асэнсоўваецца кімсьці інакш — напаўняецца ціхім і светлым роздумам...



Аляксандра Янушка, 15 гадоў. "Вечаровы Магілёў".

КУЛЬТУРА
№ 1 / 4 студзеня 2014 г. / 4

# ЛЮТЫ 2014

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| ПН | | 3 | 10 | 17 | 24 |
| АЎТ | | 4 | 11 | 18 | 25 |
| СР | | 5 | 12 | 19 | 26 |
| ЧЦ | | 6 | 13 | 20 | 27 |
| ПТ | | 7 | 14 | 21 | 28 |
| СБ | 1 | 8 | 15 | 22 | |
| НДЗ | 2 | 9 | 16 | 23 | |

Марыя Півачук, 14 гадоў. "Дух зімы".





Таісія Практыка, 14 гадоў. "Навагодняя цацка".



Бахром Хакімаў, 16 гадоў. "Зорны шлях".

## Дзіцячая школа выяўленчых мастацтваў г. Брэста

## "Ой, сівы конь бяжыць..."

Ну, вядома ж, Год Драўлянага Каня!.. На наш погляд, кампазіцыя з адлюстраваннем казачнага героя, які жыве на сваёй зямлі і сілкуецца яе гісторыяй ды явай, пра што сведчыць цудоўны пейзаж у прасторы ягонай душы, — вельмі прыцягальная рэч! "Абрамленне" — таксама спалучана з "вобразам" Каня і па-свойму цікава ўбачана юнымі дараваннямі. І як сімвал месяца лютага — "снежная прыгажуня" з птушкай, прадвесніцай хуткай вясны.



Арына Ільіна, 14 гадоў. "Снягурка".

# САКАВІК 2014

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| ПН | | 3 | 10 | 17 | 24 | 31 |
| АЎТ | | 4 | 11 | 18 | 25 | |
| СР | | 5 | 12 | 19 | 26 | |
| ЧЦ | | 6 | 13 | 20 | 27 | |
| ПТ | | 7 | 14 | 21 | 28 | |
| СБ | 1 | 8 | 15 | 22 | 29 | |
| НДЗ | 2 | 9 | 16 | 23 | 30 | |



Карына Вербавая, 13 гадоў. «Колеравы эксперымент».

Жанна Казанда, 12 гадоў. «Батлейка».



Дзіцячая мастацкая школа г. Віцебска

## "Абдаравала зямельку вясна..."

Прывабная абстрактная кампазіцыя, сатканая з рознакаляровых плоскасцей, плям, рытмаў, ліній, выклікае ўражанне вясновай радасці і цёплых свежых пачуццяў.

*Згінулі сцюжы, марозы, мяцеліцы.*
*Болей не мерзне душа ні адна,*
*Сонейкам цёпленькім, зеленню вабнаю*
*Абдаравала зямельку вясна.*

(Янка Купала)



Лізавета Свешнікава, 14 гадоў. «Гарадскі матыў».

КУЛЬТУРА

# КРАСАВІК 2014

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| ПН | | 7 | 14 | 21 | 28 |
| АЎТ | 1 | 8 | 15 | 22 | 29 |
| СР | 2 | 9 | 16 | 23 | 30 |
| ЧЦ | 3 | 10 | 17 | 24 | |
| ПТ | 4 | 11 | 18 | 25 | |
| СБ | 5 | 12 | 19 | 26 | |
| НДЗ | 6 | 13 | 20 | 27 | |



Міхаіл Дайлідаў, 17 гадоў. "Экспрэсія".

Марына Барэйша, 16 гадоў. "Бег часу".



**Слуцкая дзіцячая мастацкая школа мастацтваў**

## “...Ўжо рунее трава, к сабе кліча зямля...”

Зусім “дарослы” экспрэсіўны пейзаж, які выпраменьвае не толькі настрой бурлівай вясны, але і музыку дзёрзкай колеравай гармоніі. “Пасдарасламу” пераканаўчыя і іншыя карцінкі, насычаныя фантазійнымі ўяўленнямі пра рознааблічны свет, як яго бачаць юныя аўтары.



Паліна Баран, 11 гадоў. "Жаніх і нявеста".

КУЛЬТУРА
№ 1 / 4 студзеня 2014 г. / 7

# МАЙ 2014

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| ПН | | 5 | 12 | 19 | 26 |
| АЎТ | | 6 | 13 | 20 | 27 |
| СР | | 7 | 14 | 21 | 28 |
| ЧЦ | 1 | 8 | 15 | 22 | 29 |
| ПТ | 2 | 9 | 16 | 23 | 30 |
| СБ | 3 | 10 | 17 | 24 | 31 |
| НДЗ | 4 | 11 | 18 | 25 | |

Ксенія Кацапава, 9 гадоў. "Дрэва жыцця".





Кірыла Вайцянкоў, 10 гадоў. "Вось што такое шчасце!".



Соф'я Дзічэнкава, 12 гадоў. "Сон у месяцовую ноч".

## Дзіцячая мастацкая школа г. Гомеля

## "Мой родны кут, як ты мне мілы..."

Захапленне жыццём — інакш і не скажаш! Радасць! Песня! Вясёлка, птушкі, вясковыя ўтульныя хацінкі, цёплая зямля — усё прыемна пахне ў гэтым дзівосным свеце. На гэты твор хочацца доўга глядзець, бо гэта той свет, які праявіўся ва ўяўленні маленькага мастака і які ён асабіста спасціг увачавідкі. Так бы мовіць, узяў з "натуры"...



Валерыя Салега, 12 гадоў. "Які цудоўны гэты свет...".

# ЧЭРВЕНЬ 2014

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| ПН | | 2 | 9 | 16 | 23 | 30 |
| АЎТ | | 3 | 10 | 17 | 24 | |
| СР | | 4 | 11 | 18 | 25 | |
| ЧЦ | | 5 | 12 | 19 | 26 | |
| ПТ | | 6 | 13 | 20 | 27 | |
| СБ | | 7 | 14 | 21 | 28 | |
| НДЗ | 1 | 8 | 15 | 22 | 29 | |

Ганна Баўшэвіч. "На даху".



Алаўціна Пракаповіч. "Залева".



Карына Дзямідзік. "Захад сонца ў горадзе".



Дзіцячая мастацкая школа мастацтваў г. Гродна

## "Ой, ты лета, гарачае, буйнае..."

Сапраўдны impressionnisme! Як тут і нам не захапіцца тымі ўражаннямі юнага мастака, якія яго ахапілі на роднай беларускай зямлі! Дакладнасць адлюстравання, свежасць першага ўспрыняцця прыроды, багацце рэфлексаў і колеравых адценняў, вібрацыя светлапаветранага асяроддзя — усяму гэтаму мог бы пазайздросціць сам Клод Манэ! А чаму б і не? Але тут, у творы — Беларусь!



Марыя Мурына. "Мае канікулы".

КУЛЬТУРА

№ 1 / 4 студзеня 2014 г. / 9

# ЛІПЕНЬ 2014

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| ПН | | 7 | 14 | 21 | 28 |
| АЎТ | 1 | 8 | 15 | 22 | 29 |
| СР | 2 | 9 | 16 | 23 | 30 |
| ЧЦ | 3 | 10 | 17 | 24 | 31 |
| ПТ | 4 | 11 | 18 | 25 | |
| СБ | 5 | 12 | 19 | 26 | |
| НДЗ | 6 | 13 | 20 | 27 | |



Юлія Бобр, 13 гадоў. "Гуканне...".

Вольга Ілліючэнка, 11 гадоў. "Цудоўны лес".



Вераніка Казловіч, 15 гадоў. "Свято маёй мары".



## Мазырская дзіцячая мастацкая школа мастацтваў

## "Дзе Купала начавала..."

"Ой, рана на Йвана... Дзе Купала начавала..." Спрадвечная песня нашых прашчураў і нашых сучаснікаў... Ну проста цудоўна зроблена сонечнае папяровае пано, якое, на наш погляд, пры адпаведным павелічэнні ў памерах, магло б упрыгожыць інтэр'ер утульнага дзіцячага садка!.. І якія пранізліва чыстыя кампазіцыі ў ніжняй частцы выяўленчай прасторы нашай газетнай паласы: тут і арнаменты, і аўтарская кампазіцыя, якая сапраўды выпраменьвае мару. Яна — пра дзяўчынку, што з падаконніка высотнага дома пазірае ўніз, на родны горад, і марыць, марыць... Яна, як тая птушка, лунае думкамі ў нябёсах...

Арына Гуцко, 13 гадоў. "Каляровая фантазія".





# ЖНІВЕНЬ 2014

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| ПН | | 4 | 11 | 18 | 25 |
| АЎТ | | 5 | 12 | 19 | 26 |
| СР | | 6 | 13 | 20 | 27 |
| ЧЦ | | 7 | 14 | 21 | 28 |
| ПТ | 1 | 8 | 15 | 22 | 29 |
| СБ | 2 | 9 | 16 | 23 | 30 |
| НДЗ | 3 | 10 | 17 | 24 | 31 |


Алёна Карпеня, 16 гадоў. "Чырвоныя пеўні".

Ліза Голубева, 10 гадоў. "Дрэвы".


**Заслужаны аматарскі калектыў "Апалон" Ляхавіцкага гарадскога дома культуры**

## "Устану ранкам насустрач сонцу..."

Усхваляваны "дыялог" фантастычных птушак — уладароў Сусвету: вось яны, вялікія і моцныя, на фоне шагалаўска-мітуслівага правінцыйнага гарадка, маляўніча раскіданага ў прасторы зямных турбот... А побач — спакойна-сузіральныя матывы: дрэвы і хаткі, з комінаў якіх струменіцца дым; светлы нацюрморт з фруктамі, чайнікам і кветкамі ў збанах. Жыццё ідзе...


Ксенія Васілевіч, 12 гадоў. "Нацюрморт з кветкамі".

# ВЕРАСЕНЬ 2014

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| ПН | 1 | 8 | 15 | 22 | 29 |
| АЎТ | 2 | 9 | 16 | 23 | 30 |
| СР | 3 | 10 | 17 | 24 | |
| ЧЦ | 4 | 11 | 18 | 25 | |
| ПТ | 5 | 12 | 19 | 26 | |
| СБ | 6 | 13 | 20 | 27 | |
| НДЗ | 7 | 14 | 21 | 28 | |

Настасся Саўкова, 14 гадоў. "Святло Месяца".



Алена Козел, 14 гадоў. "Казкі перад сном".



Яўген Чарняўскі, 14 гадоў. "Жадаем лётаць!".



Барысаўская дзіцячая школа мастацтваў

## "Вось гэтак у добрым здароўі мы будзем ляцець і ляцець..."

Гэты твор — нібы гатовая ілюстрацыя да займальнай дзіцячай казкі. Мо кагосьці з літаратараў гэтыя вобразы і натхняць на стварэнне яе ў рэальнасці! І будуць чытаць тую казку дзеткам сцямнелымі вераснёўскімі вечарамі. Гульня цацак — вясёлая, заўзятая, квяцістая. Здаецца, што адкрытая кніга ў цэнтры кампазіцыі — як сімвал таямнічасці дзіцячага малюнка... Акварэльная празрыстая чысціня пачуццяў — і ў творах, якія побач... І яшчэ адну работу, як палёт юначых мараў, можна таксама разглядаць ілюстрацыяй — хіба ж гэта не навявае ўспамін пра Купалавы радкі з "Хлопчыка і лётчыка"?

КУЛЬТУРА

# КАСТРЫЧНІК 2014

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| ПН | | 6 | 13 | 20 | 27 |
| АЎТ | | 7 | 14 | 21 | 28 |
| СР | 1 | 8 | 15 | 22 | 29 |
| ЧЦ | 2 | 9 | 16 | 23 | 30 |
| ПТ | 3 | 10 | 17 | 24 | 31 |
| СБ | 4 | 11 | 18 | 25 | |
| НДЗ | 5 | 12 | 19 | 26 | |

Дзіяна Жэгздрын, 13 гадоў. "У Лукамор'я".



Аляксандр Качалка, 13 гадоў. "За межамі Радзімы".



Мікалай Зарубайка, 11 гадоў. "Шырокі размах".



Лідская дзіцячая мастацкая школа мастацтваў

Уладзімір Балыка, 10 гадоў. «Лядовае пабоішча».



## "Я малюю паветра кастрычніка..."

Кажуць, што дзіця больш аддае перавагу яркім фарбам. Але — не заўсёды. Часам яно і ў чорна-белай графіцы можа ствараць штосьці цікавае, выбудоўваць свой, толькі яму вядомы, казачны, свет. І тут з дапамогай лініі і штрыха першароднае значэнне набывае нястомная дзіцячая фантазія, у дадзеным выпадку звязаная з вобразам фантасмагарычнай істоты-птаха. Эксклюзіў алоўка — эксклюзіў дзяцінства...

# ЛІСТАПАД 2014

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| ПН | | 3 | 10 | 17 | 24 |
| АЎТ | | 4 | 11 | 18 | 25 |
| СР | | 5 | 12 | 19 | 26 |
| ЧЦ | | 6 | 13 | 20 | 27 |
| ПТ | | 7 | 14 | 21 | 28 |
| СБ | 1 | 8 | 15 | 22 | 29 |
| НДЗ | 2 | 9 | 16 | 23 | 30 |

Хрысціна Аўрусевіч, 14 гадоў. "Пернікавы горад".





Соф'я Сліжыкава, 16 гадоў. "Брыз".



Дар'я Качанава, 15 гадоў. "Птушкі".

Дзіцячая мастацкая школа імя І.Ф. Хруцкага г. Наваполацка

## "І тчэ, забыўшыся, рука..."

У складанай габеленавай стыхіі калажа-аплікацыі, у рытмічных перапляценнях нітак, у дакладна выверанай гульні дэкаратыўных форм і каляровай пластыкі паўстае вобраз "этнічнай" Восені. А мо гэта толькі мы, дарослыя, дамыслілі, што такой утульнай уявіў яе юны творца? Бо ў шэрым золкім лістападзе так хочацца сагрэцца бліскавіцамі цяпла нітак, захутацца ў іх… Апошні месяц восені — кожны з юных талентаў прэзентуе па-свойму (зноў жа — праз наша бачанне): ён, лістапад, — то ў ружовым святле ўспамінаў, то ў паўднёвым святле экзатычных дамкоў, то — паказаны праз фактурныя прадметы па-даросламу эстэцкага нацюрморта…



Еўфрасінія Аксяневіч, 17 гадоў. "Ганарымся мінулым, будуем будучыню".

# СНЕЖАНЬ 2014

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| ПН | 1 | 8 | 15 | 22 | 29 |
| АЎТ | 2 | 9 | 16 | 23 | 30 |
| СР | 3 | 10 | 17 | 24 | 31 |
| ЧЦ | 4 | 11 | 18 | 25 | |
| ПТ | 5 | 12 | 19 | 26 | |
| СБ | 6 | 13 | 20 | 27 | |
| НДЗ | 7 | 14 | 21 | 28 | |

Карына Волкава, 8 гадоў. "Зімовыя гульні".





Кацярына Сцефаненка, 12 гадоў. "Ціхі сон".



Яўгенія Бачкова, 13 гадоў. "Першы снег".

## Крычаўская дзіцячая мастацкая школа мастацтваў

### "Ой мяцеліца, ой мяцеліца..."

Вельмі цікавая кампазіцыя, пабудаваная на кантрасце халодных і цёплых колераў і адценняў. Сюжэт пра тое, як у салодкі сон дзіцяці ўрываецца доўгачаканая чароўная Зіма ў вобразе казачнай прынцэсы-прыгажуні. Жывапіс — цалкам самакаштоўны, і можна смела разглядаць яго як эстэтычную з'яву ў шматаблічнай прасторы дзіцячага мастацтва.



Аляксандра Новікава, 8 гадоў. "Я і мае сяброўкі".

# Чатырнаццаць ідэй для 2014-га

**Цягам года “К” штотыднёва друкавала асабістыя рэйтынгі інтэрнэт-ідэй нашых суачыннікаў, так ці інакш звязаных з культурай, — пяцьдзясят два чалавекі склалі свае топ-5. Прапануем чытачу азірнуцца і ўспомніць 14 лепшых інтэрнэт-ідэй мінулага года.**

**Юрый МАКСІМЕНКА, вучоны сакратар Гомельскай абласной універсальнай бібліятэкі:**

— У Фінляндыі і ва Украіне выкарыстоўваецца такая арыгінальная форма кіравання чытаннем, як фарміраванне падборак літаратуры ў прывабных торбах з прывабнымі слоганамі тыпу: “Книжкова торбина для всієї родини” (“Кніжная сумачка для ўсёй сям’і”). Чытач, які спяшаецца, можа без чаргі схапіць торбачку з падборкай кніг і часопісаў для ўсёй сям’і, а калі запоўніць анкету ды пазначыць, што чытаюць члены яго сям’і, тады здолее атрымліваць кнігі і па індывідуальных заказах у далейшым. Чым не падтрымка сямейнага чытання?

**Юрый ЗЯЛЕВІЧ, дырэктар Музея-сядзібы “Пружанскі палацык”:**

— Перасоўная выстаўка (музей). Канешне, шмат для якіх музеяў краіны гэта не навінка. Але размова ідзе пра перасоўную выстаўку разам… з выставачнай залай. У мінулым годзе бачыў на пачатку лета матэрыял пра замежную галерэю, якая стварыла такую лёгкую для мантажу выставачную прастору з падвясным асвятляльным абсталяваннем у выглядзе вялікага белага куба. Такая зала магла б з’явіцца ў любым месцы, дзе ёсць электрычнасць і наведвальнікі. Такім чынам, не чалавек прыходзіць у выставачную залу, а сама зала прыходзіць да чалавека! Галоўнае — добра спраектаваць такі часовы будынак.

**Святлана КРЫВЕЦ, загадчык аддзела бібліятэчнага маркетынгу Лідскай цэнтральнай раённай бібліятэкі імя Янкі Купалы:**

— У бібліятэках Даніі для прыцягнення юных чытачоў і фарміравання ў падлеткаў пачуцця прыналежнасці да бібліятэчнай прасторы праходзяць мерапрыемствы “Mindspot” — “Месца ідэй”. Моладзь збіраецца, абмяркоўвае думкі, выказвае прапановы і пажаданні, што датычацца бібліятэчных сэрвісаў і праграм. У выніку гэтых дзей арганізоўваецца Art Wall — “Арт-сцяна”, утварэнне для рэалізацыі творчага патэнцыялу моладзі.

**Юрый ІГРУША, дырэктар “Беларускага відэацэнтра”, кінатэлепрадзюсар:**

— У Расіі на самым высокім дзяржаўным узроўні ініцыявалі стварэнне Фонду крэатыўных ідэй. Праз названую структуру дзяржава будзе адбіраць для далейшага фінансавання і прасоўвання знойдзеныя ў Сеціве ідэі. Асаблівая ўвага мае надавацца сацыяльна значным праблемам. Глабальная мэта — знайсці працоўныя месцы для крэатыўнай моладзі. Ужо цяпер гаворыцца, што падтрымку дзяржавы атрымаюць, прынамсі, суполкі ў Інтэрнэце, электронныя бібліятэкі, сайты разнастайных ініцыятыў, парталы дыстанцыйнага навучання і нават карысныя гульні. У якасці перспектыўнага развіцця адзначаецца, што кліенты падобных вэб-рэсурсаў пасля набываюць тысячы людзей па ўсім свеце. Як мяркуецца, такі фонд будзе абапірацца на інструменты дзяржаўна-прыватнага партнёрства. Мне падаецца, падобны фонд мог бы з’явіцца і на Беларусі. У нас вельмі шмат крэатыўных людзей, што здольныя генерыраваць ідэі. Дык чаму б апошнія не ўрэчаісніць?




**Вольга СЕМЧАНКА, вядучы рэдактар Магілёўскага абласнога метадычнага цэнтра народнай творчасці і культурна-асветніцкай работы:**

— “Жывая гісторыя”. На мой погляд, вельмі ўдалы фармат — ён жа метад, ён жа жанр… Мне вядома, што, прынамсі, адзін такі праект рэалізуецца ў нашай краіне і мае ўласны сайт. Калі сцісла, сэнс “жывой гісторыі” ў тым, што сведка пэўных гістарычных падзей дзеліцца ўспамінамі. У адрозненне ад звычайнага інтэрв’ю і іншых сумежных жанраў, “жывая гісторыя” дае магчымасць выказацца самому чалавеку. Акурат у гэтым — галоўная каштоўнасць метаду. Мне здаецца, работнікі культуры, а таксама аматары з ліку мясцовых жыхароў, моладзі маглі б распачаць падобныя праекты ў сваім горадзе, рэгіёне. Аб’ектамі “жывой гісторыі” маглі б стаць пажылыя людзі — жывыя носьбіты традыцыйнай культуры, якія могуць распавесці пра гісторыю сваёй вёскі і падзеі мінулага, апісаць старасвецкі сялянскі побыт, звычаі, адносіны паміж людзьмі. У адрозненне ад этнаграфічнай экспедыцыі, якая мае збольшага дакладную, аб’ектыўную аснову, акцэнт будзе зроблены менавіта на суб’ектыўным пачатку (прыватны светапогляд, уласная ацэнка падзей і г. д.). І гэта дапаможа захаваць тое, што так цяжка зафіксаваць: дух, унутраны змест традыцыйнай культуры, сапраўдную сутнасць яе каштоўнасцей у жывым увасабленні.

**Людміла ГУРЫНОВІЧ, дырэктар Слуцкай раённай сістэмы публічных бібліятэк:**

— Геакэшынг — гэта новая форма экскурсіі па бібліятэцы. Група чытачоў дзеліцца на каманды, для кожнай выбіраецца капітаны. Каманды атрымліваюць маршрутныя лісты з каардынатамі тайнікоў і адпраўляюцца ў вандроўку. Пераможцы знаходзяць запаветны “клад”. Такая форма работы дае магчымасць чытачам самім датыкнуцца да кнігі, пакарыстацца каталогам, адчуць сябе ў бібліятэцы паўнапраўным гаспадаром. А гэта, пагадзіцеся, залог таго, што наведвальнік ізноў прыйдзе ў бібліятэку, каб правесці вольны час, папрацаваць у Інтэрнэце, пачытаць і сустрэцца з сябрамі.

**Марына ПШЫБЫТКА, загадчык навукова-даследчага аддзела бібліятэказнаўства Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі:**

— Унікальную магчымасць карыстацца электроннымі выданнямі (кнігамі, аўдыязапісамі, перыёдыкай) не выходзячы з дома прадастаўляе бібліятэка Інстытута імя Гётэ. Тут распрацаваны спецыялізаваны сэрвіс Onleihe — электронны бібліятэчны он-лайн-абанемент. З дапамогай яго карыстальнікі маюць магчымасць атрымліваць выданні дахаты 24 гадзіны ў суткі цягам усяго тыдня. Вяртаць нососьбіты інфармацыі ў такую бібліятэку не трэба: пасля сканчэння тэрміну карыстання атрыманы файл проста не адкрыецца.

**Людміла ДУДАРАВА, начальнік аддзела культуры Дубровенскага райвыканкама:**

— Інтэрнэт — гэта дзейсны сродак рэкламы. Менавіта ў Сеціве можна сустрэць найбольш цікавыя моманты з мерапрыемстваў нашага раённага Дома культуры. Так, пераможца шоу-праграмы “Супербабуля-2012” Таццяна Толчыкава стала папраўдзе знакамітай пасля таго, як фрагмент “візітоўкі”, дзе бабуля чытае… рэп, быў размешчаны ў Інтэрнэце. Яго паглядзела 25 690 чалавек, у тым ліку карыстальнікі з Канады, Украіны, Расіі… Пасля такога рэкорду сюжэты пра “Супербабулю” і пра наш раённы Дом культуры былі зняты на СТБ, АНТ… Больш за тры тысячы праглядаў — у музычнага нумара, які стаў пераможцам раённай шоу-праграмы “Хвіліна славы”. Доўга абмяркоўваліся ў нашым горадзе рэкламны ролік Клуба маладой сям’і “Гармонія” раённага Дома культуры, асобныя нумары з шоу-праграмы для моладзі “Ідэальны хлопец”… Таленавітая творчая моладзь нашага РДК спрабуе сябе і ў запісах кліпаў, што таксама можна сустрэць у Сеціве.

**Вольга ВОЎК, загадчык аддзела бібліятэчнага маркетынгу Цэнтралізаванай сістэмы дзіцячых бібліятэк г. Мінска:**

— Сторытэлінг — гэта распавяданне гісторый. Вядома, што інфармацыя лепш успрымаецца, калі яна пераказана сваімі словамі: простымі, размоўнымі, расказанымі чалавекам, якому давяраеш. Відаў сторытэлінгу вельмі шмат (культурны, сацыяльны; міфы, паданні і інш.) — усё залежыць ад таго, з якой мэтай адбываецца пераказ. У бібліятэках за мяжой сторытэлінг вельмі распаўсюджаны, нават існуюць прафесійныя сторытэлеры.

**Алена ЛЯШКОВІЧ, дырэктар Дзяржаўнага літаратурнага музея Янкі Купалы:**

— 3D-тэхналогія прадстаўлена ў экспазіцыі. У другой чарзе новай экспазіцыі мы таксама плануем выкарыстоўваць яе ў тэатральнай зале. У наведвальнікаў з’явіцца магчымасць праглядаць у гэтым фармаце запісы купалаўскіх спектакляў. У тэатральнай зале неўзабаве будзе ўстаноўлены і трывізар, які дасць магчымасць пабачыць выявы музейных прадметаў (да прыкладу, тэатральныя касцюмы) з кожнага боку і без 3D-акуляраў.

**Алена АРЦЁМАВА, старшы навуковы супрацоўнік Літаратурнага музея Петруся Броўкі:**

— Пастаянна адшукваю ідэі для правядзення Ночы музеяў. Наша апошняя тэма, да прыкладу, называлася “Ажылыя пяцідзясятыя”. Інтэрнэт падказаў шэраг цікавых форм. У кватэрах-музеях Санкт-Пецярбурга вельмі актыўна карыстаюцца такім прыёмам, як актуалізацыя інтэр’ераў. І мы звярнуліся да сяброў — мінскага філіяла маскоўскага тэатра-школы “Вобраз”. Артысты падрыхтавалі ў нашых інтэр’ерах вельмі сімпатычныя тэатральныя пастаноўкі, у тым ліку і паводле твораў Данііла Хармса.

**Віталь ГАЎРЫЛАЎ, загадчык навукова-інфармацыйнага аддзела Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка:**

— Цяпер ужо не толькі кожны супрацоўнік, але і наведвальнікі павінны мець доступ у Інтэрнэт у сценах музея. Вось на пачатку гэтага года пры адкрыцці ў адным з нашых філіялаў стацыянарнай выстаўкі “Прагулка па Ніжне-Пакроўскай” запусцілі пробны бясплатны Wi-Fi для наведвальнікаў. Ён распаўсюджваецца як у памяшканні ўстановы, так і ў музейным дворыку. Гэта дало магчымасць выкарыстоўваць сістэму QR-кодаў для размяшчэння дадатковай інфармацыі па экспазіцыі музея. Цяпер наведвальнік можа прасканаваць код і атрымаць інфармацыю з сайта музея на трох мовах. З дапамогай гэтай жа тэхналогіі можна пашыраць магчымасці аўдыягіда.

**Аляксандр ЗІНКЕВІЧ, дырэктар Рэспубліканскай мастацкай галерэі “Палац мастацтва”, мастак:**

— Google запусціў выдатны праект —“Art Projekt”. Тут выкладзены выявы высокай якасці, прадстаўлена вялікая колькасць галерэй. Праект карысны для чалавека, які любіць наведваць выставачныя пляцоўкі, любавацца мастацтвам, але не мае магчымасці выязджаць непасрэдна на месца дзеяння. Плюс шмат досыць цікавых замежных галерэй з выдатнымі фатаграфіямі экспанатаў і пастаяннае папаўненне базы.

**Сяргей ГРЫНЕВІЧ, жывапісец, член Беларускага саюза мастакоў:**

— У Сеціве шмат сайтаў па мастацтве. Самы вядомы, міжнародны, — www.art-info.com — расказвае пра мастакоў, выстаўкі, арт-кірмашы, якія праходзяць у свеце. Я гэтым цікаўлюся і час ад часу наведваю найбольш значныя фестывалі і арт-кірмашы, удзельнічаю ў экспазіцыях. Айчынныя ж спецыялізаваныя сайты па мастацтве пачалі з’яўляцца зусім нядаўна, і іх не так шмат. Ёсць, канешне ж, і гарадскія сайты, з мастацкімі рубрыкамі, але менавіта спецыялізаваных — мала.

**Падрыхтавала Вольга НАВІЦКАЯ**

